**Сяргей Піваварчык**
(Гродна)

## Беларускае Панямонне ў раннім сярэднявеччы (X-XIII ст.ст.)

Беларускае Панямонне — гісторыка-этнаграфічны рэгіён Беларусі, які выдзяляецца па комплексе спецыфічных этнакультурных прызнакаў і займае тэрыторыю Гродзенскай і сумежных частак Брэсцкай і Мінскай абласцей. У гістарыяграфіі ён часта ўспамінаецца пад тэрмінам „Чорная Русь". Але мы лічым, што называць Панямонне X-XIII ст.ст. дадзеным тэрмінам неправамерна, паколькі па летапісах і іншых сярэдневяковых пісьмовых крыніцах гэта назва невядома. Спробы даследчыкаў высветліць этымалогію тэрміна „Чорная Русь" і якім чынам ён замацаваўся на тэрыторыі Беларусі пакуль што не даюць пераканаўчых вынікаў[1].

Асноўнымі крыніцамі па вывучэнні гісторыі Беларускага Панямоння ў раннім сярэднявеччы з'яўляюцца археалагічныя і пісьмовыя. Аднак канкрэтныя звесткі па гісторыі рэгіёна ў старажытных пісьмовых крыніцах сустракаюцца рэдка. Летапісы, як правіла, у асноўным узгадваюць факты палітычнага жыцця. Гэта тлумачыцца перш за ўсё характарам саміх летапісаў, асноўнай мэтай якіх было адлюстраванне падзей дзяржаўнага значэння. На змест паведамленняў уплывалі таксама асабістыя погляды летапісца, агульная палітычная сітуацыя, тэрытарыяльная аддаленасць ад месца напісан-

[1] *Імя тваё Белая Русь*, Мінск 1991, с. 27-30, 66-87, 117-136; Д. В. Карев, *„Черная Русь". Распространённые историографические версии и конкретные исторические реалии*, [в:] *Проблемы отечественной истории и культуры периода феодализма* (чтения В. Б. Кобрина), Минск 1992, с. 82-85.

ня летапісаў. Па гэтых прычнах аднавіць аб'ектыўную гісторыю рэгіёна даволі складана.

Тэрыторыю Беларускага Панямоння людзі пачалі засяляць у эпоху мезаліту. У VII ст. да н.э. тут пачынае фарміравацца культура штрыхаванай керамікі. З V ст. н.э. гэта культура замяняецца культурамі ўсходнелітоўскіх курганоў і банцараўскай, этнічную прыналежнасць якіх большасць даследчыкаў лічыць балцкай[2].

Па праблеме этнічнага складу насельніцтва Беларускага Панямоння ў раннім сярэднявеччы ў літаратуры існуе некалькі пунктаў погляду. Большасць даследчыкаў (Ф. Гурэвіч, П. Лысенка і іншыя) асноўным насельніцтвам у X-XIII ст.ст. лічаць дрыгавічоў. А. Сядоў мяркуе, што жылі тут ятвягі і іх славяназаваныя нашчадкі[3]. Аналіз матэрыялаў з археалагічных помнікаў Панямоння паказвае, што насельніцтва рэгіёна ў X-XIII ст.ст. было поліэтнічным. Цяжка выдзеліць які-небудзь раён, дзе пераважала адзінае ў этнічным плане насельніцтва. Засяленне рэгіёна славянамі адбывалася з двух накірункаў: паўднёвага (дрыгавічы, валыняне, драўляне) і паўночна-ўсходняга (крывічы).

Наяўнасць у рэгіёне храналагічна розных груп могільнікаў і матэрыялы паселішчаў дазваляюць гаварыць аб дзвюх асноўных хвалях славянскай каланізацыі. Першая хваля накіравалася сюды ў 2-ой палове X — XI ст.ст. Гэта пацвярджаецца тым, што на ранніх стадыях існавання паселішчаў назіраюцца паўднёвыя традыцыі ў домабудаўніцтве і кераміцы. У XII ст. на Беларускае Панямонне прыходзіцца новы прыток насельніцтва з поўдня, што звязана з узмацненнем Галіцка-Валынскага княства. Адначасова з гэтымі працэсамі назіраецца інфільтрацыя крывічоў і мазаўшан. Усе славянскія плямёны ўступалі ў цесныя кантакты паміж сабой і балцкім насельніцтвам, узаемна ўзбагачаючы матэрыяльную і духоўную кудьтуру. У гэтым заключаецца этнічная спецыфіка Беларускага Панямоння, якое знаходзіцца на памежжы рассялення розных плямёнаў.

Гіпатэтычна ўцягванне насельніцтва Панямоння ў палітычную гісторыю мы можам звязваць з паходамі князёў Уладзіміра і Яраслава на ятвягаў і Літву ў 983, 1038, 1040 гг.[4]. Пры гэтым ёсць звесткі, што месца перамогі Яраслава над Літвой у 1040 г. — „на полях слонімскіх"[5]. Паходы Яраслава на Літву і ятвягаў азначалі пашы-

2 *Белорусская археология. Достижения археологов за годы советской власти*, Минск 1987, с. 63, 73-74.

3 В. В. Седов, *Восточные славяне в XI-XII вв.*, Минск 1982, с. 120.

4 *Повесть временных лет*, Москва — Ленинград 1950, ч. I, с. 58, 103; *Новгородская четвертая летопись*, [в:] *Полное собрание русских летописей* (далей *ПСРЛ*), т. IV, ч. 1, выд. 1, Петроград 1915, с. 116.

5 *Живописная Россия. Литовское и Белорусское Полесье*, Минск 1993, с. 195.

рэнне ўплыву Кіеўскага княства. Па ўсёй бачнасці, тут сутыкнуліся інтарэсы Яраслава і полацкага князя Брачыслава. Але паколькі князі былі саюзнікамі, іх сутыкненне не вылілася ў адкрытую ўзброеную барацьбу. Паміж князямі былі падзелены сферы ўплыву на балцкіх землях — Яраслаў замацоўваўся ў левабярэжным Панямонні, Брачыслаў — у Падзвінні.

Асноўнай пісьмовай крыніцай па гісторыі Панямоння ў раннім сярэднявеччы з'яўляецца галіцка-валынскі звод Іпацьеўскага летапісу. Звесткі, якія захаваліся ў зводзе, дзеляцца на два храналагічныя перыяды. Першы адносіцца да XII ст. і звязаны выключна з **Горадзенем** (Гродна). Менавіта ён часцей за іншыя панёманскія гарады ўзгадваецца ў летапісе, прычым спачатку не сам горад, а мясцовыя князі. Другі перыяд прыпадае на другую палову XIII ст., калі панёманскія землі сталі арэнай барацьбы літоўскіх і галіцка-валынскіх князёў.

Лічыцца, што першае ўзгадванне аб гарадзенскіх князях адносіцца да 1116 г.: „том же лете Володимер (Манамах) отда дщерь свою Агафью за Всеволодка"[6]. З паведамлення невядома, дзе знаходзіўся князь і ці быў ён у Горадзені. Аднак пад 1128 г. летапіс паведамляе аб паходзе на Полацак і адзначае „Всеволодку из Городна"[7]. Як вядома, паход на Полацкую зямлю арганізаваў Мсціслаў Уладзіміравіч адначасова з чатырох напрамкаў. Усеваладка ўзначаліў адзін з іх. У сувязі з гэтымі звесткамі мы можам гаварыць аб існаванні ў Панямонні ўдзельнага княства на чале з кянзем Усеваладкам Давыдавічам. З летапісу вядома, што ва Усевалада і Агаф'і былі тры сыны і дзве дачкі. Нашчадкі Усевалада прымалі на працягу XII ст. актыўны ўдзел у палітыцы кіеўскіх князёў, аб чым і паведамляе летапіс[8]. Да 1183 года адносіцца апошняе за XII ст. летапіснае паведамленне ад Горадзені і адзінае, што тычыцца жыцця самага горада: „Того же лета Городен погоре всь и церкы каменая от блистания молние и шибения грома"[9].

Неабходна адзначыць, што скупыя звесткі аб пачатковым перыядзе жыцця горада выклікалі спрэчкі ў гісторыкаў наконт таго, дзе знаходзіўся Горадзень. Адны лічылі, што гэта сучаснае Гродна на Нёмане. Іншыя меркавалі, што яго аддаленасць ад галоўнага тэатра палітычнай барацьбы ў XII ст. — Падняпроўя — не дазваляе звязваць з ім летапісныя звесткі. Таму яны бачылі летапісны Горадзень у аднайменным мястэчку Гародна (Гарадная) на паўднёвы

[6] *Ипатьевская летопись*, [в:] *ПСРЛ*, т. II, Москва 1962, с. 284.

[7] Там жа, с. 292.

[8] Там жа, с. 410, 413, 424, 426, 427, 433, 528, 538, 574, 631.

[9] Там жа, с. 634.

ўсход ад Пінска. Трэція дзялілі летапісныя звесткі і адносілі падзеі XII ст. да Гародна пінскага, а падзеі XIII ст. звязвалі з Гроднам нёманскім. Здаецца, археалагічныя раскопкі ў Гродне павінны пакласці канец спрэчкам, дзе шукаць Горадзен XII стагоддзя. Але М. Ермаловіч у сваёй „Старажытнай Беларусі" лічыць месцазнаходжанне летапіснага горада праблематычным[10]. Мы вернемся да гэтага пытання ніжэй, калі будзем разглядаць археалагічныя крыніцы.

Сярэдзіна XIII ст. знаменуецца новай увагай летапісцаў да падзей у Панямонні. У Іпацьеўскім летапісе пад 1237 г. упершыню ўзгадваецца навагародскі князь Ізяслаў, якога Даніла Раманавіч галіцкі „возведе" разам з Літвой Міндоўга на мазавецкага князя Конрада[11]. Новагародак быў цэнтрам асобнага княства, якое было васалам ці саюзнікам моцнага Галіцка-Валынскага княства.

Другая палова XIII ст. адзначана барацьбой галіцка-валынскіх князёў з літоўскімі за панёманскія землі. У 1252-1253 гг. князь Даніла Галіцкі здзяйсняе паходы на панёманскія гарады, якія былі ў той час пад уладай Міндоўга[12]. Тады ж на старонкі пісьмовых крыніц трапляюць **Новагародак** (Навагрудак), **Ваўкавыеск** (Ваўкавыск), Услонім (Слонім), Турыйск. Вынікам паходу 1253 года „На Літву, на Новагародак" з'явіўся мірны дагавор 1254 года, па якому Панямонне перадавалася сыну Данілы — князю Раману. Пад 1256 г. у Іпацьеўскім летапісе паведамляецца аб дзейнасці яшчэ двух панёманскіх князёў —— Глеба Ваўкавыскага і Ізяслава Свіслацкага. Яны разам з Раманам Навагародскім удзельнічалі ў паходзе галіцка-валынскіх князёў супраць ятвягаў[13]. Гэта гаворыць аб існаванні ў Панямонні яшчэ двух удзельных княстваў. У 1259 годзе татарскі ваявода Бурундай пры падтрымцы галіцка-валынскага войска ўварваўся ў Панямонне, аднак падпарадкаваць не змог[14]. У Новагародку ў гэты час князем быў ужо сын Міндоўга Войшалк, якому ўдалося перацягнуць на свой бок Таўцівіла, схапіць і забіць Рамана[15].

На працягу наступных дзесяцігоддзяў татарскія і залежныя ад іх галіцкія князі яшчэ неаднойчы спрабавалі падпарадкаваць панёманскія землі, але поспеху не мелі[16]. У другой палове XIII ст., нягледзячы на цяжкую барацьбу, новае дзяржаўнае ўтварэнне — Вялікае княства Літоўскае, ядром якога з'явіліся панёманскія землі —

[10] М. Ермаловіч, *Старажытная Беларусь: Полацкі і новагародскі перыяды,* Мінск 1990, с. 259.

[11] *Ипатьевская летопись* [в:] *ПСРЛ*, т. II, Москва 1962, с. 776.

[12] Там жа, с. 819, 828.

[13] Там жа, с. 847.

[14] Там жа, с. 847.

[15] Там жа, с. 847.

[16] Там жа, с. 847, 874-878, 911.

змагло выстаяць, а потым і павялічыць сваю тэрыторыю за кошт як балцкіх, так і ўсходнеславянскіх зямель. Такім чынам па пісьмовай крыніцы вядома пра існаванне на Панямонні пяці гарадоў: Горадзеня (Гродна), Новагародка (Навагрудка), Ваўкавыеска (Ваўкавыска), Услоніма (Слоніма), Турыйска. Яшчэ некалькі паселішчаў узгадваецца ў „Спісе рускіх гарадоў" (XIV ст.). Гэта **Гальшаны**, **Ліда**, **Крэва**, а таксама (на думку вядомага маскоўскага археолага В. Сядова) **Астрэя** і **Вевярэск**. Аб старажытным горадзе **Мсцібогаве** пісаў храніст XVI ст. Мацей Стрыйкоўскі. Калі ж узніклі гэтыя гарады і што ўяўлялі сабой да часу ўспамінання ў летапісе? І ці наогул былі яшчэ ў Панямонні гарады? У летапісе гаворыцца, што падчас паходу ў 1252 годзе войскі Данілы Галіцкага „поидоста к Новогородку и паимаша грады многы и возвратишися в домы свои"[17]. На гэтыя пытанні можна адказаць толькі з дапамогай археалагічных крыніц. За апошнія гады з'явіліся новыя археалагічныя матэрыялы, якія дазваляюць пашырыць веды аб Беларускім Панямонні X-XIII ст.ст.

У гістарыяграфіі спрэчным з'яўляецца пытанне першага пісьмовага ўспаміну **Новагародка**. Лічыцца, што сам горад упершыню ўзгадваецца ў сувязі з паходам галіцкіх князёў у 1252 годзе, пра які мы гаварылі вышэй: „Данило же Василко поидоста к Новогородку"[18]. Але да сярэдзіны XIII ст. Новагародак быў ужо не толькі цэнтрам асобнага княства. Летапісныя звесткі гавораць аб існаванні цэлай гістарычнай вобласці— Новагародскай зямлі, за якую ваявалі галіцкія князі — „плениша всю землю Новогородьску"[19]. Тэрмін „зямля" А. М. Насонаў атаясамліваў з назвамі „воласць" і „вобласць", мяркуючы, што так называліся феадальныя дзяржавы[20].

М. Дзмітрыеў сцвярджаў, што Новагародак быў заснаваны ў 1116 годзе сынам Уладзіміра Манамаха Яраполкам[21]. М. Ціхаміраў лічыў, што Новагародак упершыню ўпамінаецца ў 1212 годзе[22]. У Ноўгарадскім IV летапісе пад 1044 г. паведамляецца: „Ходи Ярослав на Литву, а на весну заложил Новогород и сделал и"[23]. Яшчэ больш падрабязна аб гэтай падзеі гаворыцца ў летапісе, які чытаў рускі гісторык В. Тацішчаў і які не дайшоў да нас: „1044 того же году ходил Ярослав на

[17] Там жа, с. 816.

[18] Там жа, с. 816.

[19] Там жа, с. 818.

[20] А. Н. Насонов, *„Русская земля" и образование территории древнерусского государства. Историко-географическое исследование*, Москва 1951, с. 26, 87.

[21] М. А. Дмитриев, *Несколько слов исторического обозрения Новогрудка*, „Вестник Императорского Русского географического общества", Санкт-Петербург, т. XXIV, 1858, с. 230.

[22] М. Н. Тихомиров, *Древнерусские города*, Москва 1956, с. 42.

[23] *Новгородская четвертая летопісь*, [в:] *ПСРЛ*, т. IV, ч. 1, вып. 1, Петроград 1915, с. 116.

Литву, и на весну заложил Новгород и совершил того же лета". Гісторык дае наступны каментарый да гэтага паведамлення: „Сие разумеется о литовском Новогородке, но паче мнится о северском, ибо с сего времени о нем упоминаться началось"[24]. В. Тацішчаў быў першым гісторыкам, хто хаця з агаворкамі, але звязаў летапісныя звесткі з Навагародкам Панёманскім. Гэта меркаванне падтрымлівае М. Ермаловіч[25]. Па іншаму лічылі вядомыя гісторыкі М. Барсаў, Г. Лаўмянскі, У. Пашута[26]. З імі пагаджаецца беларускі гісторык Г. Штыхаў. Па тэксце летапісу, вядома, цяжка сказаць, які горад тут успамінаецца — Ноўгарад Вялікі, Ноўгарад Севярскі, Навагародак на Асцёры, ці Навагародак Панёманскі. Мы са свайго боку хацелі б указаць на тыя моманты, якія гавораць на карысць таго, што ўжо ў XI ст. сапраўды Навагародак выходзіць на гістарычную арэну.

Ва ўсіх названых летапісах заснаванне Навагародка звязваецца з паходам Яраслава на Літву. Закладванне горада павінна было забяспечыць панаванне Кіева над Літвой. Аб гэтым сведчыць хуткае ўзвядзенне яго абарончых збудаванняў, якое працягвалася толькі вясну і лета. Таму спрыялі многія ўмовы. Навагародак займаў зручнае геаграфічнае становішча. Ён размясціўся ў цэнтры ўзвышанасці, з захаду, поўначы і ўсходу яго акружалі рака Нёман і густыя лясныя масівы. Горад заснаваўся не на пустым месцы. Як сведчаць археалагічныя матэрыялы, да сярэдзіны XI ст. тут жылі ўжо славянскія плямёны. Існаванне ў раёне Навагародка (Навагрудка) храналагічна розных груп могільнікаў дазволіла К. В. Паўлавай вылучыць дзве хвалі славянскай каланізацыі на Верхняе Панямонне[27]. Першая хваля славян накіравалася сюды ў 2-ой палове X ст. Пацвярджаецца гэта і матэрыяламі раскопак Навагрудка, дзе пецярбургская археолаг Ф. Гурэвіч на ранніх стадыях існавання паселішча праслядзіла паўднёвыя традыцыі ў домабудаўніцтве, а М. Малеўская ў тэхніцы вытворчасці навагародскай керамікі адзначыла рысы, сходныя з керамікай Валыні[28].

[24] В. Н. Татищев, *История Российская*, 1963, т. 2, с. 79.

[25] М. Ермаловіч, *Старажытная Беларусь*, с. 103.

[26] Барсов Н. П., *Очерки Русской исторической географии*, Варшава 1885, с. 40; H. Łowmiański, *Studia nad początkami społeczeństwa i państwa Litewskiego*, Wilno 1932, t. XVII, s. 273.; В. Т. Пашуто, *Образование литовского государства*, Москва 1959, с. 11.

[27] К. В. Павлова, *Население Верхнего Понеманья по материалам курганных магильников окрестностей Новогрудка*, [в:] *Древнерусское государство и славяне*, Минск 1983, с. 45-47.

[28] Ф. Д. Гуревич, *О планировке и застройке древнего Новогрудка*, „Краткие сообщения института археологии" (далей: КСИА), вып. 205, 1991, с. 45-51; Малевская М. В., *Некоторые исторические связи Новогрудка в X в.*, КСИА, вып. 129, 1972, с. 14-20.

Адно з самых ранніх паселішчаў узнікла на пагорку Малы Замак не пазней канца X ст. і было неўмацаваным (дакладней умацаванні былі самыя простыя — у выглядзе драўлянага вастракола). Суседняя Замкавая гара засялялася пазней, прыкладна, у першай палове XI ст. і некаторы час з'яўляецца другім неўмацаваным паселішчам. Як сцвярджае Ф. Гурэвіч, да сярэдзіны XI ст. на Замкавай гары ўзводзіцца вал з драўлянымі ўмацаваннямі — гароднямі і паселішча становіцца дзядзінцам старажытнага горада, пад аховай якога знаходзіўся неўмацаваны пасад-паселішча на Малым Замку. Паблізу горада размяшчаўся курганны некропаль (Брацянка)[29]. Як бачым, да сярэдзіны XI ст. Навагрудак набыў планавую структуру, характэрную для ўсходнеславянскага горада. Заўсёды, калі ў летапісе паведамляецца аб заснаванні тым ці іншым князем горада (Новага ці Вялікага), размова ідзе аб будаўніцтве ўмацаванняў вакол дзядзінца. Таму больш дакладна будзе гаварыць не аб заснаванні Новагародка ў сярэдзіне XI стагоддзя, а аб змяненні функцыі першапачатковых славянскіх паселішчаў на Замкавай гары і Малым Замку. Невыпадкова зямненне функцыі паселішчаў звязана з актыўнай палітыкай кіеўскага князя ў Панямонні, аб чым і паведамляюць летапісы. Ператварыўшыся з двух неўмацаваных паселішчаў у апорны пункт на мяжы з Літвой і ў цэнтр славянскай каланізацыі краю, Новагародак да сярэдзіны XIII ст. стаў эканамічынм і культурным цэнтрам цэлай гістрычнай вобласці — Новагародскае зямлі.

Нявырашаным з'яўляецца пытанне: у адносінах да якога цэнтра горад названы „Новым”. Абапіраючыся на археалагічныя крыніцы, мы прапаноўваем вырашыць яго наступным чынам: горад названы „новым” у адносінах да тых двух славянскіх паселішчаў, якія існавалі да таго, як адзін з іх быў абнесены абарончымі збудаваннямі. Тут мы назіраем працэс сінайкізму: два суседнія родавыя паселішчы аб'ядноўваюцца ў адзін горад. Атрымаўшы абарончыя збудаванні, горад і стаў „Новагародкам” — „новым” у адносінах да ранніх паселішчаў, што не мелі ўмацаванняў і „новым” наогул у гэтым рэгіёне.

Пачатак жыцця на гродзенскай Замкавай гары археолаг і гісторык М. Воронін адносіў да другой паловы і нават да канца XI ст. Ён лічыў, што Горадзен (Гродна) у першую чаргу з'яўляўся крэпасцю на мяжы з ятвягамі і Польшчай[30].

Раскопкі 80-х гадоў у Гродне дазваляюць па-іншаму вырашыць пытанне старыжытнай гісторыі Гродна. Было ўстаноўлена, што сла-

[29] Ф. Д. Гуревич, *Древние города Белорусского Понеманья*, Минск 1982, с. 6.
[30] Н. Н. Воронин, *Древнее Гродно*, Москва 1954, с. 17.

вянскае паселішча на Замкавай гары ўзнікла ў канцы X ст.[31] Аналіз керамікі паказаў, што разам з дрыгавічамі і валынянамі ў каланізацыі гэтай часткі Панямоння ўдзельнічалі і жыхары Мазовіі. Зручнае геаграфічнае становішча прыšvяло да хуткага росквіту паселішча і ператварэння яго ў горад і ў сталіцу княства. XII стагоддзе ў гісторыі горада адзначана трохметровым культурным слоем. Горадзен XII-XIII ст.ст. — гэта буйны рамесна-гандлёвы цэнтр, які падтрымліваў цесныя сувязі з іншымі гарадамі і землямі: Кіевам, Валынню, Прыбалтыкай, Заходняй Еўропай.

У канцы XII ст. тут склалася мясцовая (гародзенская) архітэктурная школа, якая характарызуецца своеасаблівасцю як па тэхнічных прыёмах, так і па асноўных кампазіцыйных прынцыпах. Да помнікаў гэтай школы адносяцца цэрквы — Ніжняя (на Замкавай гары), Прачысценская (на пасадзе), Барысаглебская (Каложская) у Гродне, недабудаваны храм на ваўкавыскім Замчышчы, а таксама княжацкі церам і ўнікальныя абарончыя ўмацаванні на гарадзенскім дзядзінцы. Не так даўно, падчас археалагічных даследаванняў на тэрыторыі Новага Замка (вакольны горад) быў знойдзены развал плінфы — тонкамернай цэглы, з якой будавалі храмы ў XII ст. Знаходка дазваляе меркаваць пра існаванне ў XII ст. тут яшчэ аднаго помніка — Уваскрэсенскай царквы, якая згадваецца ў дакументах XV-XVI ст.ст.[32].

Будаўніцтва каменнай царквы ў тыя часы патрабавала значных фінансавых выдаткаў і ўдзельным княствам часта было не па кішэні будаўніцтва буйных храмаў. Сведчаннем сілы і багацця княства ў XII ст. з'яўляецца колькасць культавых збудаванняў у гарадах княства, асабліва ў сталіцы. У сувязі з гэтым неабходна адзначыць, што адкрыццё ў Гродне чацвёртага па ліку храма XII ст. дае ўсе падставы для перагляду цяперашніх поглядаў на ролю гарадзенскага княства ў палітычным і эканамічным жыцці ўсходнеславянскіх зямель. Таму і няма ніякіх падстаў лічыць месцазнаходжанне летапіснага Горадзеня праблематычным, як робіць гэта М. Ермаловіч. Археолагі ўжо ўпэўнена адказалі на пытанне, дзе знаходзіўся летапісны Горадзень — гэта сучаснае Гродна.

Ваўкавыеск і Услонім (Ваўкавыск і Слонім) упершыню згадваюцца пад 1252 г. у сувязі з ужо згаданымі намі падзеямі. Аднак археалагічныя даследаванні, якія былі праведзены на помніках ваўкавыскага археалагічнага комплексу і на слонімскім Замчышчы,

[31] М. А. Ткачоў, *Археалагічныя помнікі г. Гродна*, [у:] *Археалагічныя помнікі Гродзеншчыны*, Гродна 1992, с. 5.

[32] А. К. Краўцэвіч, *Гарады і замкі Беларускага Панямоння XIV-XVIII ст.ст.*, Мінск 1991, с. 71.

сведчаць аб тым, што жыццё на іх узнікла значна раней — у X ст. Ваўкавыскі археалагічны комплекс — гэта гарадзішча старажытнага Ваўкавыска, якое складаецца з дзвюх пляцовак: Шведскай гары і Замчышча. У комплекс уваходзіць і гарадзішча Муравельнік, якое знаходзіцца за 0,5 км ад Шведскай гары. Гісторыя летапіснага Ваўкавыска цесна звязана з гэтымі археалагічнымі помнікамі.

Як лічыць археолаг Я. Зваруга, які праводзіў даследаванні на помніках, першапачаткова паселішча на Шведскай гары не было ўмацаваным і загінула ад пажару. У канцы X ст. па ўсім перыметры пляцоўкі быў насыпаны вал і Шведская гара стала дзядзінцам. Да сярэдзіны XIII ст. канчаткова склалася тапаграфія старажытнага Ваўкавыска і стаў ён горадам. На захад ад дзядзінца (Шведскай гары), дзе жыла арыстакратыя (князь, знаць, дружына), меўся ўмацаваны вакольны горад (Замчышча), дзе жыў гандлёва-рамесны люд, а вакол абедзвюх пляцовак размяшчаліся неўмацаваныя паселішчы самых бедных рамеснікаў і прышлых людзей. Што тычыцца Муравельніка, то жыццё на гэтым гарадзішчы працягвалася прыкладна на працягу паўстагоддзя (канец X — першая палова XI ст.ст.). Гарадзішча адразу было ўмацавана валам і выконвала функцыі ахоўнай крэпасці[33].

Археалагічныя раскопкі выявілі багатую матэрыяльную культуру горада. Асабліва ўражвае шматлікасць прадметаў зброі, рыштунку вершніка і баявога каня. У колькасных адносінах гэтыя знаходкі пераважаюць над астатнімі катэгорымі рэчаў. Горад, які ўзнік на краю славянскіх зямель, увесь час стрымліваў націск розных ворагаў. Сярод прадметаў зброі ў ваўкавыскай калекцыі ёсць фрагменты мячоў, шпоры, якія маюць арнамент і пазалоту, спецыяльныя баявыя сякеры.

Паводле летапісу Услонім (Слонім) па дагаворы 1254 года належыў Раману Данілавічу. У 70-я гг. XIII ст. князь Трайдзень уключыў Слонім у вялікакняжацкія ўладанні і насяліў раёны Гродна і Слоніма прусамі. Галіцкі князь Леў Данілавіч паспрабаваў вярнуць з дапамогай татар Панямонне, але адваяваў толькі Слонім і Турыйск. Згодна летапісу, у 80-х гг. XII ст., ва Услоніме княжыць Васілька, які ваяваў з валынскім князем Уладзімірам Васількавічам і прынёс яму „весь годну и добычу”[34].

Месцазнаходжанне летапіснага Услоніма да нядаўняга часу было невядома. Даследчыкі шукалі яго сляды ў ваколіцах сучаснага Слоніма. Аднак рэшткі старажытнага гарадзішча былі знойдзены ў цэнтры горада, дзе знаходзіцца Замчышча.

[33] Я. Г. Зверуго, *Древний Волковыск X-XIV вв.*, Минск 1975, с. 134-135.
[34] *Ипатьевская летопись*, [в:] *ПСРЛ*, т. II, Москва 1962, с. 819, 874-875.

У 1959 і 1970 гг. на ўзвышшы, дзе па сведчанні хронік знаходзіўся замак Яна Радзівіла, атрыманы матэрыялы, якія пераканаўча сведчаць, што ў другой палове XII стагоддзя Услонім быў багаты і добра ўпарадкаваны горад[35]. Пра час узнікненя горада нельга сказаць нешта канкрэтнае ў сувязі з малым вывучэннем паселішча. Пакуль можна лічыць, што ў канцы XI ст. паселішча на слонімскім замчышчы ўжо існавала. На наш погляд старажытны Услонім узнік у канцы X ст. Мы ўжо адзначалі, што засяленне Панямоння славянамі ішло з поўдня і наўрад ці Услонім, які знаходзіцца ў паўднёвай частцы рэгіёна ў спрыяльных геаграфічных умовах, узнік пазней за іншыя гарады. Горад развіваўся з ахоўнай крэпасці, пра што гаворыцць яго этымалогія „услоно" — засланіць, абараніць.

Неабходна ўказаць і на значную колькасць археалагічных помнікаў (каля 30) з матэрыяламі X-XIII ст.ст. у наваколлі горада. Сярод іх прыцягваюць увагу археалагічныя комплексы: гарадзішчы і селішчы каля вёсак **Талькаўшчына**, **Асабнякі** на **Косаўскім** тракце. Наяўнасць вялікай колькасці славянскіх помнікаў гаворыць аб інтэнсіўнай каланізацыі гэтых месцаў, прычым назіраецца існаванне так званых гнёздаў пасяленняў. Верагодна, што на месцы дзядзінца Слоніма спачатку існавала паселішча славянскай абшчыны ў суседстве з аналагічнымі пасяленнямі, каля ўзгаданых вёсак. Урочышча „Дубы", дзе ў 20-я гады быў знойдзены каменны язычаскі ідал, мусіць, выконвала функцыі свяцілішча — агульнага рэлігійнага цэнтра суседскіх абшчын. Зручнае размяшчэнне паселішча на высокім беразе ракі Шчары, далейшы працэс феадалізацыі грамадства спрыялі хуткаму развіццю Услоніма і ператварэнню яго ў цэнтр сельскай акругі, горад-крэпасць, а ў далейшым — у сталіцу княства.

**Турьск** (Турыйск) у летапісе з'яўляецца адначасова з іншымі гарадамі Панямоння. У доказ на вышэйзгаданы паход галіцка-валынскіх князёў на пачатку 50-х гг. XIII ст. сын Міндоўга (па ўсёй бачнасці Войшалк), „воева около Тоўрьска". Сутыкненне ў 1276 годзе Льва Данілавіча і Уладзіміра Васільковіча з Трайдзенем і Серпуціем кончылася тым, што „Володимер же противу тому, послав взяв у него Тоуриск на реце Немне, у сёла около нега поима"[36]. І хаця М. Ермаловіч сцвярджае, што „цяжка сказаць, дзе знаходзіўся гэты горад, магчыма і на месцы сучаснай вёскі Турэц (Карэліцкі раён)", археолагам дакладна вядома месцазнаходжанне гэтага летапіснага горада[37]. Яго гарадзішча знаходзіцца на ўсходняй ускраіне сучаснай вёскі Турыйск (Шчучынскі раён), на правым беразе ракі Нёман.

[35] Г. И. Пех, *Раскопки древнего Слонима*, [в:] *Древности Белоруссии*, Минск 1966, с. 276-279; *Очерки по археологии Белоруссии*, ч. 2, Минск, 1972, с. 148.

[36] *Ипатьевская летопись*, [в:] *ПСРЛ*, т. II, Москва 1962, с. 874.

[37] М. Ермаловіч, *Старажытная Беларусь*, с. 338.

Аналіз археалагічных матэрыялаў дазваляе ахарактарызаваць Турыйск як невялікі горад — адміністрацыйны цэнтр сельскай акругі. Час яго ўзнікнення — канец XI стагоддзя. Спачатку гэта было неўмацаванае славянскае паселішча. Пасля пажару, які знішчыў першапачатковае паселішча, узвышша на якім яно знаходзілася з напольнага боку было ўмацавана валам. Адначасова сталі засяляцца навакольныя мясцовасці, утвараючы такім чынам пасады. Паселішча ператварылася ў крэпасць, з якой затым і вырас невялікі гарадок. Тое, што гэта сапраўды летапісны Турьск, дазваляе сцвярджаць комплекс тых прызнакаў, якія і вылучаюць горад: планіроўка (дзядзінец і пасад), тэрыторыя засялення каля 1,5 га, магутнасць культурнага слою да 1,5 м, рэшткі рамеснай вытворчасці (у першую чаргу металургіі і апрацоўкі жалеза), знаходкі ў культурным слоі — фрагменты амфар, шкляныя бранзалеты, высокамастацкія касцяныя вырабы, кніжная засцёжка. Археолагі адзначаюць блізкасць матэрыяльнай культуры Гродна і Турыйска[38]. Верагодна з развіццём феадальных адносін гарадзенскія князі зрабілі Турыйск цэнтрам збору падаткаў з мясцовай сельскай акругі. Адначасова ён быў крэпасцю на мяжы гарадзенскага княства і навагародскага. Сваю назву горад атрымаў ад невялічкай рачулкі Тур'я, якая працякае побач і ўпадае ў Нёман.

Такім чынам, аналіз археалагічных і пісьмовых крыніц дазваляе сцвярджаць наступнае: узнікненне гарадоў у Панямонні звязана са з'яўленнем тут славян і эвалюцыяй усходнеславянскага грамадства. Выдзяляюцца тры этапы ў станаўленні і развіцці панёманскіх гарадоў: першы этап — канец X — першая палова XI ст.ст. — узнікненне неўмацаваных (абшчынных) паселішчаў у выніку славянскай каланізацыі рэгіёна. Першапачаткова ўмацаванні меў толькі Гарадзен (і то з напольнага боку). Другі этап — сярэдзіна XI — першая палова XII ст. — фарміраванне тыповай гарадской тапаграфіі (дзядзінец плюс вакольны горад ці пасад) і гарадской культуры. Трэці этап — другая палова XII — XIII ст.ст. — эканамічны і культурны росквіт гарадоў, ператварэнне іх у адміністратыўныя, эканамічныя, ваенныя, культурныя і ідэалагічныя цэнтры рэгіёна.

Усе гарады ўзніклі і развіваліся сярод сельскіх паселішчаў, у месцах, дзе былі найбольш спрыяльныя ўмовы для земляробства. У сілу таго, што Панямонне было перыферыяй славянскай каланізацыі, тут няма гарадоў, якія развіваліся з племянных цэнтраў. Сярод насельніцтва гарадоў пры пераважаючым усходнеславянскім элеменце (дрыгавічы, крывічы, валыняне) назіраецца наяўнасць заходнеславянскага (мазавецкага) і балцкага элементаў. Тлумачыц-

[38] Я. Г. Зверуго, *Верхнее Понеманье в XI-XIII вв.*, Минск 1989, с. 75.

ца гэта пагранічным становішчам і наяўнасцю тут да прыходу славян балцкага аўтахтоннага насельніцтва.

У больш познім летапісным „Спісе рускіх гарадоў далёкіх і блізкіх" успамінаецца яшчэ некалькі панёманскіх пасяленняў. Я. Навумаў лічыў, што „Спіс" быў складзены ў 1394-1396 гг., а яго аўтар называў гарадамі ўсе ўмацаваныя паселішчы[39]. Выкарыстаны ў „Спісе" і крыніцы больш ранняга часу. Першымі ў „Спісе рускіх гарадоў" узгадваюцца **Ліда**, **Крев камен**, **Гальшаны**, **Лошаск**. Да таго часу ўжо існавалі каменныя мураваныя замкі ў Лідзе, Крэва. А вось археалагічныя раскопкі на гарадзішчах каля вёсак Гальшаны і Лоск выявілі матэрыялы, якія датуюцца XI-XVII ст.ст. Мураваны замак у Гальшанах быў пабудаваны ў першай палове XVII ст.[40] Таму не ўзнікае сумненне, што ў спісе гаворыцца аб ранніх гарадзішчах каля Гальшан і Лоска. Менавіта яны з'яўляюцца „продкамі" сучасных пасяленняў. Паводле „Хронікі Быхаўца" заснаваў Гальшаны легендарны князь па імені Гольшыс (Гальшан)[41]. Аднак гэта былі не гарады ў сацыяльна-эканамічным сэнсе, а хутчэй яны выконвалі функцыі памежных крэпасцей і феадальных сядзіб — замкаў.

З імем рэальнай гістрычнай асобы можна звязаць узнікненне вельмі цікавага помніка — гарадзішча каля вёскі **Мсцібава** (Ваўкавыскі раён). Пасяленне ўпершыню ўспамінаецца ў Хроніцы М. Стрыйкоўскага (XI ст.), калі князі Даніла і Васілька „взяли Слоним, Волковыск, и Мстибогов под Мендогом", г.зн. у сувязі з падзеямі XIII ст., пра якія ўжо гаварылася. У гэтай жа Хроніцы Мсцібогаў прыгадваецца яшчэ раз, калі размова ідзе пра выдзяленне ўдзелаў сынам Гедыміна ў сярэдзіне XIV ст.: „Карыяту был выделен Новогрудок, княство с Волковыском и Мстибоговом"[42].

Відаць, дзякуючы гэтым звесткам гісторыкі XIX ст. адносілі Мсцібогаў да значнага горада[43]. Але хутчэй гэта быў не горад, а феадальная сядзіба — замак.

У Іпацьеўскім летапісе гаворыцца аб тым, як у 1202 годзе князь Уладзімір Ігаравіч і галіцкія баяры, якія здрадзілі князю Данілу Раманавічу, паслалі ва Уладзімір (Валынскі) святара з прапановай выдаць ім дзяцей князя Рамана. Уладзімірцы хацелі забіць святара,

[39] Наумов Е. П., *К истории летописного „Списка русских городов дальних и близких"*, [в:] *Летописи и хроники*, Москва 1973, с. 150-163.

[40] М. А. Ткачев, *Замки Белоруссии*, Минск 1987, с. 150-163.

[41] *Хроники: Литовская и Жамайская и Быховца. Летописи: Баркулабовская, Аверки и Панцырного*, [в:] *ПСРЛ*, т. XXXII, Москва 1975, с. 134-135.

[42] M. Stryjkowski, *Kronika Polska, Litewska i Żmudska i wszystkiej Rusi*, Warszawa 1846, s. 382.

[43] *Живописная Россия*, Минск 1993, с. 203.

аднак „Мстибог и Мончюк и Микифор реша не падобаеть нам убити посла”. Летапісец дадае, што рабілі яны гэта „имеяху болесть во сердце своем яко предати хотеху господу свою и град”[44]. З тэксту летапісу можна дапусціць, што Мсцібог, Манчук і Мікіфар былі прадстаўнікамі баярскай партыі, варожай князю Данілу. Пра ўплывовае становішча Мсцібога сярод уладзімірскіх баяр гаворыць упамінанне яго першым.

Археалагічныя даследаванні, праведзены на гарадзішчы, выявілі нязначны культурны слой з фрагментамі керамікі XIII-XVIII ст.ст. і падмуркам нейкай пабудовы. Мяркуючы па кераміцы, дадзенае пасяленне ўзнікла не раней XIII ст. Яго заснаванне можна звязваць з імем баярына Мсцібога, які ў выніку бурных падзей пачатку XIII ст. уцёк з Валыні ў Панямонне, пад абарону добра ўмацаванага Ваўкавыска (15 км ад Мсцібава). Пацвярджэннем з’яўляецца і сам тапонім — у пісьмовых крыніцах XVI-XVII ст.ст. пасяленне ўзгадваецца як Мсцібогаў гарадок, а потым Мсцібогаў[45]. Аднак у сілу розных абставін, жыццё на гарадзішчы працягвалася нядоўгі час, літаральна некалькі дзесяцігоддзяў, затым спынілася, пакінуўшы нязначны культурны слой. Другі перыяд жыццядзейнасці на гарадзішчы звязаны з XVI-XVIII ст.ст., калі Мсцібогаў быў цэнтрам воласці.

Не менш цікавым помнікам уяўляецца гарадзішча ў трох кіламетрах ад мястэчка Астрына, каля вёскі **Кульбачына**. Яно размешчана на беразе ракі Астрынкі і належыць да тыпу гарадзішчаў, умацаванні якіх не залежаць ад рэльефу мясцовасці. Падобныя гарадзішчы будаваліся ўжо ў X-XI ст.ст. Менавіта той факт, што гарадзішча знаходзіцца на беразе Астрынкі, даў магчымасць даследчыку В. Сядову лічыць гэты помнік летапісным горадам **Астрэя**[46].

Аб інтэнсіўным жыцці на гарадзішчы сведчаць шматлікія знаходкі. Як звычайна на падобных пасяленнях, тут знойдзена вялікая колькасць рэшткаў ганчарнага посуду, жалезныя вырабы, праселкі, тачыльныя камяні, рэшткі жорнаў, шкляныя бранзалеты, пацеркі са шкла і бурштыну, бронзавая фібула. Але асаблівую цікавасць выклікаюць прадметы зброі. Да зброі блізкага бою адносяцца два ланцэтападобныя наканечнікі дзідаў. Дадзены тып быў распаўсюджаны ў Скандынавіі ў часы вікінгаў. Самы блізкі (і пакуль што адзіны) аналог кульбачынскім наканечнікам на тэрыторыі Усходняй Еўропы вядомы з раскопак курганных старажытнасцей у Гнёз-

44 *Ипатьевская летопись*, [в:] *ПСРЛ*, т. II, Москва 1962, с. 201.

45 И. И. Лаппо, *Великое княжество Литовское во II-ой пол. XVI столетия. Литовско-русский повет и его сеймик*, Юрьев 1911, с. 87-88.

46 В. В. Седов, *К истории поселений Черной Русі*, КСИА, вып. 139, 1974, с. 27-31.

даве (пад Смаленскам)[47]. Затое шмат аналагічных наканечнікаў знойдзена ў могільніку Лумстары ў Фінляндыі, дзе былі пахаваны ў X стагоддзі варагі[48].

У калекцыі наканечнікаў стрэлаў звяртае на сябе ўвагу значная колькасць таксама ланцэтападобных (13 экз.). Менавіта гэты тып наканечнікаў стрэлаў складае пераважную колькасць у калчанах ваяроў, пахаваных у Бірцы (Швецыя)[49].

У Панямонні ланцэтападобныя наканечнікі стрэлаў знойдзены толькі ў Ваўкавыску. Цікава адзначыць, што 20 наканечнікаў розных тыпаў былі знойдзены разам у адным месцы літаральна ў звязцы. Па ўсёй бачнасці, яны знаходзіліся ў калчане, які быў згублены.

Аналіз археалагічнага матэрыялу паказвае, што паселішча ўзнікла ў канцы X ст. у ходзе каланізацыі Панямоння славянскім насельніцтвам.

З самага пачатку гэта была крэпасць — апорны пункт асваення правабярэжжа Нёмана, у глыбі балцкіх зямель. З развіццём феадальных адносін з XII ст. пасяленне набывае рысы памежнай крэпасці (хутчэй належала да гарадзенскага княства) і феадальнай сядзібы — замка. Ну а як жа назва? Ці можна лічыць гэты помнік рэшткамі летапіснага горада Астрэя? Мы ўжо згадвалі, што помнік знаходзіцца на рацэ, якая называецца цяпер Астрынкай, а побач — гарадскі пасёлак Астрына. „Магчыма, у старажытнасці рака называлася Астрэя. У такім выпадку назва горада была вытворнай ад гідроніма", — лічыць В. Сядоў[50].

Такое меркаванне магло быць слушным да таго часу, пакуль экспедыцыя Эрмітажа не раскапала пасяленне на беразе возера Астрэя ў Пскоўскай вобласці. Там былі выяўлены рэчы старажытнарускага і больш позняга перыяду[51]. Таму ад лакалізацыі Астрэі ў Панямонні трэба адмовіцца. Таксама як і трэба адмовіцца ад лакалізацыі на Гарадзеншчыне яшчэ аднаго летапіснага горада — **Вевярэска**, які таксама ўзгадваецца ў „Спісе рускіх гарадоў далёкіх і блізкіх". Вядомы рускі гісторык М. Ціхаміраў назваў Вевярэск загадкавым горадам. А вось археолаг В. Сядоў атаясамліваў летапісны

47 Д. А. Авдусин, *О датировке гнездового кургана с мечом и раскопок М. Ф. Кусцинского*, [в:] *Культура и искусство древней Руси*, Леиннград 1957, с. 22-23, табл. 1:3.

48 П. Лехтосало-Хиландер, *Связи западных финнов с Восточной Европой в эпоху викингов*, [в:] *Финно-угры и славяне*, Ленинград 1979, с. 81, рис. 2.

49 А. Ф. Медведев, *Ручное метательное оружие: лук и стрелы, самострел VIII-XIV вв.*, Москва 1966, с. 73.

50 В. В. Седов, *К истории поселений Черной Руси*, с. 27.

51 А. М. Микляев, В. М. Солдатов, В. И. Михайлов, С. И. Янковский, *Работы на юге Псковской области*, [в:] *Археологические открытия*, Москва 1978, с. 25.

Вевярэск з гарадзішчам каля вёскі **Касцянева** (Шчучынскі раён) і лічыў, што назва горада паходзіць ад гідроніма — ракі Ваверкі (левы прыток ракі Лебяды, што ўпадае ў Нёман). Ён сцвярджаў, што горад загінуў у выніку варожага нашэсця ў XIII ст. Тыя з жыхароў, хто застаўся ў жывых, не вярнуліся на гарадзішча, а заснавалі новыя паселішчы (сучасная Ваверка ў 18 км ад гарадзішча). Аднак археалагічныя раскопкі выявілі на гарадзішчы Касцянёва матэрыялы і больш позняга часу (XV-XVII ст.ст.). Ды і малаверагодна, каб гідронім даў назву пасяленню, ад якога рака Ваверка працякае за 16-18 км, а побач знаходзіцца рака Касцянёўка. Таму і не выпадае звязваць летапісны Вевярэск з гарадзішчам каля вёскі Касцянёва.

Аднак цікавасць да гарадзішчаў Кульбачына і Касцянёва ад гэтага не змяншаецца. Наадварот, вынікі археалагічных даследаванняў праліваюць святло на такія пытанні, як, напрыклад, месца Панямоння ў сістэме міжнародных кантактаў у эпоху сярэднявечча.

З'яўленне рэчаў скандынаўскага паходжання ва Усходняй Еўропе звязваецца з існаваннем тут у X-XI ст.ст. шляху з „вараг у грэкі". Па ўсёй бачнасці Нёманска-Дняпроўскі водны шлях складаў сур'ёзную канкурэнцыю шляху „з вараг у грэкі" і быў дастаткова самастойным у сувязях Скандынавіі з басейнам Прычарнамор'я. Аб гэтым сведчаць рэчы скандынаўскага паходжання, якія былі знойдзены ў Панямонні. Да іх адносяцца шлем X-XI ст.ст. са Слоніма, перакрыжаванне мяча з-пад Гродна, згаданыя наканечнікі з Кульбачына. У Ваўкавыску знойдзены ажурныя падвескі з выявай антрапаморфных істот, шпора з пятлёй і некаторыя іншыя знаходкі. Цікава, што з Нёмана ў Днепр можна было выйсці двума шляхамі і абодва яны дзейнічалі.

Першы праходзіў па левым прытоку — Росі, далей праз волак у Ясельду і Прыпяць. Дарэчы, этымалогія Ваўкавыска звязваецца некаторымі даследчыкамі з існаваннем тут волака (Волакавыск, Высокі волак)[52]. У апошні час і на тэрыторыі суседняга Заходняга Палесся знойдзены шэраг прадметаў скандынаўскага паходжання (Франаполь, Гарадзішча пад Пінскам, Лемяшэвічы)[53]. З улікам апошніх матэрыялаў прычыны з'яўлення варагаў у Панямонні можна суаднесці з фактарам заходнепалескага шляху. Пры гэтым неабходна адзначыць, што шлях Днепр—Прыпяць—Ясельда—Нёман быў самым кароткім у сувязях Кіеўскага Падняпроўя з востравам Готланд.

52 В. Б. Перхавко, *Опыт комплексного использования письменных и материальных источников для реконструкции истории Припятско-Бугского пути в IX-XIII вв.*, [в:] *Проблемы исторической географии России*, Москва 1983, с. 21.

53 А. В. Іоў, В. С. Вяргей, *Гандлёва-эканамічныя сувязі насельніцтва Заходняга Палесся ў IX — пач. XI ст.ст.*, „Гісторыка-археалагічны зборнік", Мінск 1993, ч. 1, с. 117-119.

Другі шлях ляжаў на правым прытоку Нёмана — Бярэзіне, потым праз волак — у Свіслач, затым зноў Бярэзіна толькі ўжо Дняпроўская і далей Днепр. Існаванне важных апорных пунктаў — Крэва, Лоска, Менска, Свіслачы на гэтым шляху падкрэслівае яго важнасць. Адсюль паходзяць і два буйныя скарбы арабскіх дырхэмаў (827 экз. і 2 446 экз.), знойдзеных каля вёскі Ракаўцы (непадалёку ад Крэва)[54]. Некалькі манетных скарбаў, якія былі схаваны ў X-XI ст.ст., вядомы з вярхоўяў Пцічы і Свіслачы (Дняпроўскай) на вадападзеле Нёмана і Дняпра[55]. На думку некаторых вучоных, Нёманска—Бярэзінска—Дняпроўскі шлях у сувязях Прыбалтыкі і Скандынавіі з Падняпроўем быў больш старажытным, чым шлях „з вараг у грэкі”[56]. Зразумела, што ступень інтэнсіўнасці і эфектыўнасці выкарыстання Нёманска-Дняпроўскага шляху (як праз Бярэзіну, так і праз Рось — Ясельду) залежала ад агульнай этнапалітычнай сітуацыі на чарнаморска-балтыйскай прасторы. Але са з’яўленнам славян у Беларускім Падняпроўі і Беларускім Панямонні і ўмацаваннем Кіева гэты шлях перажываў адзін з самых яркіх сваіх перыядаў.

Такім чынам нягледзячы на скупыя летапісныя звесткі да сярэдзіны XIII ст. Беларускае Панямонне дасягнула высокага сацыяльна-эканамічнага развіцця. Гэтаму садзейнічала шэраг прычын. Тут добра было развітае земляробства, якому спрыяла ўрадлівая глеба. Панямонне з’яўлялася краем развітых рамёстваў. Тут выплаўлялася жалеза і была наладжана вытворчасць разнастайных вырабаў з яго, апрацоўваліся каляровыя і каштоўныя металы, існавалі ганчарныя, кастарэзныя і іншыя рамёствы. Рэгіён вёў ажыўлены замежны гандаль, аб чым сведчыць вялікая колькасць знойдзеных археолагамі імпартных рэчаў. Сярод пасяленняў Беларускага Панямоння мелі месца ўсе асноўныя сацыяльна-гістарычныя тыпы, характэрныя для X-XIII ст.ст.: умацаваныя паселішчы сельскіх абшчын, памежныя крэпасці, адміністрацыйна-ваенныя цэнтры валасцей, феадальныя сядзібы-замкі, гарады[57]. Хоць летапіс упершыню і ўспамінае панёманскія гарады толькі ў сярэдзіне XIII ст., але яны, як сведчыць археалогія, узніклі на 200-250 гадоў раней.

Выгаднае геаграфічнае становішча Беларускага Панямоння асабліва праявілася ў сярэдзіне XIII ст. У перыяд двух бедстваў — крыжацкай і мангольскай агрэсіі — Панямонне было адносна бяспеч-

[54] *Гродно. Энциклопедический справочник*, Минск 1987, с. 276.

[55] Г. В. Штыхов, *Клады Полоцкой земли IX-XIII вв. (топография и общая характеристика*, [в:] *Сярэдневяковыя старажытнасці Беларусі*, Мінск 1993.

[56] В. А. Булкин, В. Н. Зоценко, *Среднее Поднепровье и Неманско-Днепровский путь IX-XI вв.*, „Проблема археологии Южной Руси”, Киев 1990, с. 123.

[57] С. А. Піваварчык, *Сацыяльна-гістарычны зборнік памяці М. А. Ткачова*, ч. II, Мінск 1993, с. 93-108.

най тэрыторыяй. Таму яно ў сярэдзіне XIII ст. служыць прыстанкам для насельніцтва многіх абласцей Усходняй Еўропы, якое ратавалася ад заваёўнікаў з захаду і ўсходу. Прыліў новага насельніцтва выклікаў яшчэ большае развіццё прадукцыйных сіл гэтага рэгіёна і паспрыяў вылучэнню палітычнага ўтварэння — Новагародскай зямлі. Высокае культурнае і эканамічнае развіццё, прыліў новага насельніцтва, рост прадукцыйных сіл, канцэнтрацыя вялікіх багаццяў у руках новагародскіх феадалаў і далейшае ўмацаванне іх улады — усё гэта павялічвала палітычную вагу Новагародскай зямлі і дало ёй магчымасць стаць новым цэнтрам кансалідацыі беларускіх земляў.